Старaславянска-беларускі слоўнік.
Праект. Літара Б.

Зьміцер Саўка
Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва

Ідэя складаньня старaславянска-беларускага слоўніка ўзьнікла з прычынаў ня толькі практычнага й акадэмічнага характару, а таксама й «палітычнага».

«Практычна-акадэмічныя матывы» прадыктаваныя неабходнасьцю такога слоўніка для пэўнага кола карыстальнікаў, найперш для тых, хто знаёміцца са старaславянскімі тэкстамі як носьбітамі хрысьціянскае навукі (праваслаўныя багаслоўцы, сэмінарысты), а таксама для тых, хто вывучае старaславянскую мову зь лінгвістычнымі мэтамі (студэнты-філёлягі ды інш.). Сучаснаму беларусу тэкст, напісаны па-старaславянску, – малазразумелы, часам і наагул незразумелы, а дзякуючы немалой колькасьці міжмоўных, старaславянска-беларускіх амонімаў, пры уяўнай зразумеласьці такі тэкст мае зусім іншы сэнс, чымся здаецца неспрактыкаванаму чытачу.

Таксама старaславянска-беларускі слоўнік можа мець практычнае значэньне: яго матэрыял можа быць скарыстаны пры складаньні баўгарска-беларускага, македонска-беларускага й нават расейска-беларускага слоўніка (у дачыненьні да старaславянскіх запазычаньняў у расейскай мове).

«Палітычны аспэкт» гэтай задуме надае той факт, што расейская філялягічная навука да апошняга часу намагалася падтрымваць пачуцьцё шчыльнае лучнасьці расейскай і старaславянскай (у форме царкоўнаславянскай) моваў, што вылівалася ў ігнараваньне неабходнасьці стварэньня старaславянска-расейскіх слоўнікаў (такія слоўнікі зьявіліся толькі апошнія гады). У выніку – большасьць нават гуманітарна адукаваных людзей у Беларусі (а пагатоў у Расеі) атаесамляюць праславянскую мову (прамову, ад якой утва-

рыліся іншыя славянскія мовы) і старaславянскую мову (мову, якая ўтварылася ад праславянскае мовы).

Такім чынам, старaславянскае ў сьвядомасьці шырэйшых колаў зьвязваецца з расейшчынай, што не адпавядае сапраўднаму стану рэчаў.

Старaславянская мова зрабіла выключны ўплыў на разьвіцьцё старабеларускай мовы, асабліва на першым этапе яе разьвіцьця. Аж да позьняга сярэднявечча ёю паслугаваліся як моваю літургіі ў Вялікім Княстве Літоўскім. На Беларусі было створана – напісана й надрукавана – мноства кніг на старaславянскай мове. Яшчэ ў скарынаўскіх выданьнях зьмяшчаліся *глосы* – праобраз старaславянска-беларускага слоўніка. Такім парадкам, беларусы маюць працяглую гісторыю карыстаньня гэтаю моваю бязь нейкага пасярэдніцтва трэцяга боку.

Сярод магчымых варыянтаў назвы мовы – у навуковым сьвеце яна таксама называецца *старабаўгарская*, *старамакедонская* – мы спыніліся на тэрміне *старaславянская* зь дзьвюх прычынаў. Папершае, гэты тэрмін не аспрэчваецца ні баўгарыстамі, ні македаністамі, а значыць, з пункту гледжаньня «этнічнай прыналежнасьці» ён нэўтральны; па-другое, гэта адзіны шырака прыняты тэрмін. (Праўда, паслугаваньне гэтым тэрмінам супярэчыць адной з нашых мэтаў – імкненьню ўказаць на хібнасьць ўяўленьня пра старaславянскую мову як пра непасрэдны выток сучаснай расейскай мовы.)

Публікацыя часткі слоўніка менавіта на літару **Б** выклікана тым, што пад літарай **А** знаходзяцца выключна запазычаньні, таму лексычны матэрыял пад гэтай літарай дастаткова аднастайны. Пад літарай **Б** знаходзяцца розныя паводле паходжаньня й будовы клясы лексыкі, таму рэпрэзэнтатыўнасьць матэрыялу пад гэтай літараю значна вышэйшая, у параўнаньні з матэрыялам пад літарай **А**.

баб:а, -ы *ж* 1. карміцелька; 2. бабка-павітуха.

багър:ити, -ѭ, -иши *незак.* барвовіць, рабіць барвовым.

багър:ъ, -а *м* 1. барва, багра; 2. = **багърѣница**.

багърѣниц:а, -ѧ *ж* пурпуровыя шаты (*адзнака каралеўскай улады*).

бали:и, -ѩ *м* доктар, лекар.

баловани:ѥ, -ꙗ *н* 1. лячэньне, лекаваньне; 2. лекі.

бальств:о, -**а** *н* лекі; лячэньне, лекаваньне.

бан ьск:ъ, -**ыи** *прым.* лазенны, які мае дачыненьне да лазьні.

бан: ıa , -**ıѧ** *ж* лазьня; купаньне.

бедр:а, -**ы** *ж* сьцягно; клуб (частка цела).

бедрьнъ *прым.* багаты, шчодры.

бе *гл.* **без**

беж *гл.* **без**

без, беж, безо, безъ, безь, бес, бещ *прын.*+Р. 1. без; 2. пры выказваньні пярэчаньня, нязгоды насуперак, проці, супраць, не па, не паводле.

безаконени:ıє, безаконьни:ıє, -**ıa** *н* беззаконьне; правіна.

безакони:ıє, -**ıa** *н* злачынства, беззаконьне, парушэньне закону; правіна; няпраўда.

безаконьник:ъ, -**а** м парушальнік закону, злачынец; нягоднік.

безаконьн:овати, -**оуıѫ**, -**оуıєши** *незак.* чыніць беззаконьне, парушаць закон.

безаконьн:ъ, -**ыи** *прым.* 1. незаканамерны, які не адпавядае закону; 2. уласьцівы нягодніку, злачынны, нягодны, зладзейскі.

безаконьньє *гл.* **безаконеннıє**

безбожьн:ъ, -**ыи** I *прым.* бязбожны.

безбожьн:ъ, -**ыи** II *субст.* бязбожнік.

безбожьств:о, -**а** *н* бязбожнасьць, бязбожжа.

безбо зни:ıє, - **ıa** *н* сьмеласьць, адвага, бясстрашша, харобрасьць.

безбрашьнъ *прым.*: **безбрашьно брашьно** *літар.*: яда бязь ежы (*гульня словаў*).

безбѣдьн:ъ, -**ыи** *прым.* бясьпечны.

безвещьн:ъ, -**ыи** *прым.* нярэчыўны, нематэрыяльны.

безвиньн:ъ, -**ыи** *прым.* нявінны, бязьвінны, невінаваты.

безводьн:а, -**ы** *ж* бязводная пустэча.

безводьн:ъ, -**ыи** *прым.* бязводны, сухі.

безврѣменьн:ъ, безъврѣменьн:ъ, -**ыи** *прым.* 1. пазачасавы; 2. дачасны; нясвоечасовы.

безвѣдънъ *гл.* **безвѣдьнъ**

безвѣдьн:ъ, -**ыи** *прым.* які ня ведае; ненаўмысны, несьвядомы; **тьма безвѣдьна ıa** цемра няведаньня.

безвѣстьн:ъ, -**ыи** *прым.* невядомы; няясны.

безгнѣвьн:ъ, -**ыи** *прым.* той, каму не ўласьцівая злосьць; нязлосны, лагодны, рахманы.

безгоди:ıє, - **ıa** *н* неспрыяльная, неадпаведная пара.

безгодьнѣ *прысл.* ня ў час, не ў пару, нясвоечасова.

безградьник:ъ, -**а** *м* чалавек без радзімы.

безгрѣшьн:ъ, -**ыи** *прым.* бязгрэшны.

бездарьствьн:ъ, -**ыи** *прым.* няўдзячны.

безден- *гл.* **бездън-**

бездобь *прысл.* дарэмна, надарэмна, марна, безвынікова.

бездродьн:ъ, -ыи *прым.* невысакародны, невысакароднага/нешляхецкага паходжаньня, паспаліты; бязродны.

бездръпътьн:ъ, -ыи *прым.* бясслоўны, які ўсё прымае без пярэчаньня.

бездрѣвьнъ *прым.* не драўляны, ня з дрэва.

бездоушьн:ъ, -ыи *прым.* нежывы, без душы.

бездъжди:ѥ, - ꙗ *н* сухмень, засха.

бездън:а, -ы *ж,* **бездъни:ѥ, бездьни:ѥ, -ꙗ** *н* бездань, прадоньне, прорва.

боздън:ъ, -ыи *прым.* бяздонны.

бездьна *гл.* **бездъна.**

бездьниѥ *гл.* **бездъниѥ.**

безименьнъ *прым.* безыменны, безназоўны, неназваны.

безлобьнъ *гл.* **безълобьнъ**

безлѣтьнъ *прым.* пазачасавы, які не старэе, для якога не ўласьцівы працэс старэньня.

безмездьникъ *гл.* **безмьздьникъ.**

безмилостив:ъ, -ыи *прым.* неміласэрны.

безмлъви:ѥ, безмльви:ѥ, -ꙗ *н* цішыня, ціша; бязгучча.

безмлъвьн:ъ, -ыи *прым.* маўклівы, бязмоўны; ціхі.

безмлъвьстви:ѥ, -ꙗ *н* бязмоўнасьць, (пакорлівае) маўчаньне.

безмьздьник:ъ, -а *м* бескарысьлівы чалавек, бяссрэбнік.

безмльвиѥ *гл.* **безмлъвиѥ.**

безмѣрьнъ *прым.* нязьмерны, бязьмерны.

безмѫжьн:ъ, -ыи *прым.*: **безмѫжьнъ мѫжь** муж толькі па назве, муж толькі перад людзьмі, намінальны муж.

безнадеждънъ *гл.* **безнадеждьнъ**

безнадеждьн:ъ, -ыи *прым.* які страціў надзею, роспачны, роспачлівы.

безначѧльно *прысл.* без пачатку.

безо *гл.* **без.**

безок:овати, -оуѭ, оукши *незак.* быць бессаромным\дзёрзкім\нахабным, нахабнічаць.

безочьств:о, -а *н* бессаромнасьць, дзёрзкасьць, нахабнасьць, нахабства.

безплачьнъ *гл.* **бесплачьнъ**

безпѫтьнъ *гл.* **беспѫтьнъ**

безскръбънъ *гл.* **бескръвьнъ**

безоуман *прым.* неразумны.

безоуми:ѥ, -иꙗ *н* неразумнасьць; вар'яцтва.

безоумл :ь, -ии *прым.* неразумны; вар'яцкі.

безоумьл ь *гл.* **безоумл ь**

безоумьник:ъ, -а *м* неразумны чалавек; вар'ят.

безоумьн:ъ, бесоумьн:ъ, -ыи *прым.* = **безоумл ь.**

безчѧдьнъ *гл.* **бещѧдьнъ**

безъ *гл.* **без**

безъврѣменьнъ *гл.* **безврѣменьнъ**

безълобив:ъ, -ыи *прым.* нязлосны, незласьлівы, бяззлобны, лагодны, рахманы, мірны; бязьвінны; бясхітрасны, няхітры.

безълоби:ѥ, -ꙗ *н* нязлобнасьць, незласьлівасьць, бяззлобнасьць, дабрыня, лагоднасьць, рахманасьць; бязьвіннасьць.

безълобьн:ъ, -ыи *прым.* = **безълобивъ.**

безъратии *прым.* мірны, без вайны.

безъчоувьствьнъ *гл.* **бещоувьствьнъ**

безъчьствовати *гл.* **бещьствовати.**

безь *гл.* **без.**

безьлобьнъ *гл.* **безълобьнъ.**

бес *гл.* **без**

бес- *гл. таксама* **без-**

бесада *гл.* **бесѣда.**

бесвѣтьнъ *прым.* пазбаўлены сьвятла, безь сьвятла.

бесквръвьнъ *гл.* **бескръвьнъ.**

бескврьньн:ъ, -ыи *прым.* беззаганны; бязгрэшны.

бесконьчьн:ъ, -ыи *прым.* бясконцы.

бескръбьн:ъ, -ыи *прым.* спакойны, мірны; бестурботны, бесклапотны.

бескръвьн:ъ, -ыи *прым.* бяскроўны.

бесловесьн:ъ, -ыи *прым.* 1. бясслоўны, бязмоўны, які не мае дару мовы (*пра жывёл*); 2. нямы; 3. *перан.* неразумны.

бесловьн:ъ, -ыи *прым.* неразумны; непрадуманы, няўзважаны.

беслъньн:ъ, -ыи *прым.* пазбаўлены сонечнага сьвятла, без сонца, нясонечны.

беспечальн:ъ, -ыи *прым.* бестурботны, бесклапотны; спакойны.

бесплачьн:ъ, -ыи *прым.* які бязь сьлёз\плачу\скаргаў\нараканьняў.

бесплодьн:ъ, -ыи *прым.* няплодны, бясплодны.

бесплътьно *прысл.* бесьцялесна.

бесплътьн:ъ, -ыи *прым.* бесьцялесны.

беспльт- *гл.* **бесплът-**

беспосагаꙗ *прым. ж* (*м* і *н* няма) незамужняя.

бесправьди:ѥ, -ꙗ *н* несправядлівасьць.

бесправьдьн:ъ, -ыи *прым.* несправядлівы.

бесприкладьн:ъ, -ыи *прым.* бяспрыкладны, незраўнёны.

беспрѣстани *прысл.* безупынна, безупынку; стала, увесь час.

беспѫтьн:ъ, -ыи *прым.* бездарожны, які без дарогі, які ня мае дарогі.

бесрами:ѥ, -ꙗ *н* бессаромнасьць.

бесрамък:ъ, -а *м* бессаромнік.

бесрамьн:ъ, -ыи *прым.* бессаромны, нахабны.

бессьниѥ *гл.* **бесъниѥ**

бестрасти:ѥ, -ꙗ *н* беспакутнасьць, адсутнасьць пакутаў, жыцьцё без пакутаў.

бестрастьн:ъ, -ъıи *прым.* які без пакутаў.

бестоуди:ѥ, -ꙗ *н* бессаромнасьць.

бестоудьник:ъ, -а *м* бессаромнік.

бестоудьн:ъ, -ъıи *прым.* бессаромны.

бестоудьнѣ *прысл.* бессаромна.

бестоудьц:ь, -а *м* бессаромнік.

бестьлѣни:ѥ, -ꙗ *н* незьнішчальнасьць; бесьцялеснасьць.

бестьлѣн:ъ, -ъıи *прым.* незьнішчальны; бесьцялесны.

бестьлѣньн:ъ, -ии *прым.* незьнішчальны; бесьцялесны.

бестѫжьн:ъ, -ии *прым.* які вытрым(лі)ваецца\трываецца без нараканьняў, які пазбаўлены цяжкасьцяў.

бесоуменъ *гл.* **безоумьнъ**

бесоумьнъ *гл.* **безоумьнъ**

бесхрамьник:ъ, -а *м* бясхатнік, бяздомнік; чалавек, які ня мае жытла.

бесцѣннъ *гл.* **бесцѣньнъ**

бесч- *гл. таксама* **бещ-**

бесчинаи *гл.* **бещинаи**

бесчиник *гл.* **бещиник**

бесчиньнъ *гл.* **бещиньнъ**

бесчьствиѥ *гл.* **бещьствиѥ**

бесчьствьнъ *гл.* **бещьствьнъ**

бесчьстиѥ *гл.* **бещьстиѥ**

бесъмрътиѥ *гл.* **бесъмрьтиѥ**

бесъмрътьство *гл.* **бесъмрьтьство**

бесъмрьти:ѥ, -ꙗ *н* неўміручасьць, бесьсьмяротнасьць.

бесъмрьтьство, -а *н* неўміручасьць, бесьсьмяротнасьць, несьмяротнасьць.

бесьмрътиѥ *гл.* **бесъмрьтиѥ**

бесьмрьтиѥ *гл.* **бесъмрьтиѥ**

бесъмрьтьство, -а *н* неўміручасьць, бесьсьмяротнасьць, несьмяротнасьць.

бесъни:ѥ, -ꙗ *н* бадзёраньне, чуваньне; бессань.

бесѣд:а, -ы *ж* 1. слова; прамова; 2. размова, гутарка; 3. казаньне, казань; 4. сам тэкст Эвангельля.

бесѣдовани:ѥ, -ꙗ *н* размова, гутарка.

бесѣд:овати, -оуѭ, -оуѥш и *незак.* ***къ комоу, съ къıимь, съ чѣмь, комоу*** 1. размаўляць, гутарыць; 2. сустракацца, кантактаваць.

бецѣньнъ *гл.* **бесцѣньнъ**

бещинаи, бесчинаи *прым.* нястрыманы; неўтаймоўны.

бещиница *гл.* **бещиньница**

бещини:ѥ, -ꙗ бясчынства; нястрыманасьць, неўтаймоўнасьць.

бещиньниц:а, -ѧ *ж* бясчынства; нястрыманасьць, неўтаймоўнасьць.

бєщиньн:ъ, -ъи *прым.* нястрыманы, неўтаймоўны; сьмелы, адважны, дзёрзкі.

бєщислънъ *гл.* **бєщисльнъ**

бєщисльн:ъ, -ъи *прым.* незьлічоны; бязьмерны.

бєщисмєньн:ъ, -ъи *прым.* незьлічоны.

бєщоувьствьн:ъ, -ъи *прым.* які нічога не адчувае\успрымае.

бєщьстви:ѥ, -ꙗ *н:* **бєщьствиѥ сътворити** абняславіць, зьняславіць, зглуміць.

бєщьств:овати, -оуѭ, оуѥши *незак./зак.* ганьбіць/зганьбіць, сарамаціць/пасарамаціць=прысаромець; глуміць/зглуміць.

бєщьствьн:ъ, -ъи *прым.* нягодны, які ня мае годнасьці.

бєщьстии *прым.* да якога няма пашаны, непаважаны, нешанаваны.

бєщьсти:ѥ, -ꙗ *н* няслава, ганьба, глум; **бєщьсти:ѥ сътворити** абняславіць, зьняславіць, зглуміць.

бєщьстьн:ъ, -ъи *прым.* зьняслаўлены, зглумлены; нягодны.

бєщѧдьн:ъ, -ꙗ *н* бязьдзетнасьць; няплоднасьць, бясплоднасьць.

бєщѧдьн:ъ, -ъи *прым.* бязьдзетны; бясплодны, няплодны.

бєсцѣньн:ъ, -ъи *прым.* неацэнны, бясцэнны; каштоўны.

бєчислънъ *гл.* **бє щисльнъ**

бєчисмєньнъ *гл.* **бєщисмєньнъ**

бєчистьнъ *гл.* **бєщьстьнъ**

бєчьствовати *гл.* **бєщьствовати**

бєчьстии *гл.* **бєщьстии**

бєчьстиѥ *гл.* **бєщьстиѥ**

би *форма* **быти**

бива:ти, -ѭ, -ѥши *незак.* забіваць.

бисєръ *гл.* **бисьръ**

бисръ *гл.* **бисьръ**

бисъръ *гл.* **бисьръ**

бисьр:ъ, -а *м* пэрлы; пэрліна.

бити, биѭ, биѥши = быѭ, быѥши *незак.* 1. біць; 2. бічаваць; 3. забіваць; **бити камєниѥмь** закідаць каменьнем.

бич:ь, -а *м* бізун, пуга, біч.

биѥни:ѥ, быѥни:ѥ, -ꙗ *н* біцьцё бізуном\пугаю\бічом; бічаванне.

благ:о I, **благо:оє** (*мн.* **-ага**) *н* дабро, штосьці добрае (субст. ад **благъ**).

благо II *прысл.* добра.

благожє *выкл.* добра!, так і трэба!, так і належыць!

благовол:ити, -ѭ, -иши *незак./зак.* ***на кого; о комь, чьто*** 1. спрыяць/паспрыяць, выказваць/выказаць прыязнасьць, прыхільнасьць, сымпатызаваць/праявіць сымпатыю\прыхільнасьць; 2. жадаць/пажадаць.

благоволѥни:ѥ, -ꙗ *н* спрыяньне, прыхільнасьць, міласьць, ласка, добрая воля.

благоволѥно *прысл.* прыхільна.

благовоньн:ъ, -ъи *прым.* духмяны, пахучы, пахкі.

благоврѣменьно *прысл.* акурат, (самы) час, пара, зручна, якраз.

благоврѣменьн:ъ, -ъи *прым.* своечасовы.

благовъгодьн:ъ, -ъи *прым.* адпаведны.

благовѣри:ѥ, -ꙗ *н* пабожнасьць, багабойнасьць, богабаязнасьць.

благовѣрьн:ъ, -ъи *прым.* пабожны, багабойны, богабаязны.

благовѣрьнѣ *прысл.* пабожна, багабойна, богабаязна.

благовѣств:овати, благовѣст:овати, благовѣстьств:овати, -оуѭ, -оуѥши *незак.* абвяшчаць, спавяшчаць, дабравесьціць, зьвеставаць; прапаведаваць.

благовѣ:стити, -щѭ, -стиши *незак./зак.* абвяшчаць=весьціць/абвесьціць, спавяшчаць/спавесьціць=спавясьціць.

благовѣстовати *гл.* **благовѣствовати**

благовѣстьствовати *гл.* **благовѣствовати**

благовѣща:ти, -ѭ, -ѥши *незак.* абвяшчаць=спавяшчаць (добрую вестку), дабравесьціць, зьвеставаць.

благовѣщени:ѥ, -ꙗ *н* 1. добрая вестка, дабравешчаньне; Эвангельле; 2. Дабравешчаньне, Зьвеставаньне (*сьвята*).

благоголѣньн:ъ, -ъи *прым.* які мае моцныя ногі.

благодавьц:ь, -а *м* дабрадзей, дабрачынец.

благодари:ѥ, -ꙗ *н* карысьць; дабрадзейства.

благодарь:ствити, -ствлѭ, -ствиши *незак./зак.* дзякаваць/падзякаваць; усхваляць/усхваліць, узносіць/узьнесьці падзяку.

благодарьствьн:ъ, -ъи *прым.* 1. падзячны, які мае адносіны да падзякі.

благодарѥни:ѥ, -ꙗ *н* падзяка; удзячнае ўхваленьне.

благодатє:ль, -лꙗ *м* дабрадзей, дабрачынец.

благода:ти, -мь, -си *зак.* учыніць/зрабіць дабро.

благодат:ь, -и *ж* міласьць, даброць.

благодатьник:ъ, -а *м* дабрадзей; спагаднік, спагадца.

благодатьн:ъ, -ъи *прым.* міласьцівы, поўны міласьці.

благодоуши:ѥ, -ꙗ *н* душэўны спакой; бестурботнасьць, бесклапотнасьць.

благодѣтє:ль, -лꙗ м дабрадзей, дабрачынец.

благодѣт:ь, -и *ж* 1. міласьць, даброць; 2. дабрадзейства, дабрадзейнасьць, дабро; 3. удзячнасьць, падзяка; 4. даброць, цнота; 5. прыемнасьць, прыемнае пачуцьцё.

благодѣтьн:ъ, -ъи *прым.* 1. міласьцівы, поўны міласьці; 2. дабрадзейны, міласьцівы; 3. удзячны.

благодѣ ни:ѥ, -ꙗ *н* дабрадзейства, дабрадзеяньне (*працэс*).

благодѣ :ти, -ѭ, -ѥши *незак./зак.* чыніць/учыніць дабро, рабіць/зрабіць дабро.

благоже *выкл.* добра, выдатна (*выказваньне задавальненьня*).

благоизвол:ити, -ѭ, -иши *незак./зак. на кого, на комь, о комь, въ комь* 1. любіць/палюбіць *каго-н.*; 2. спрыяць/паспрыяць, спагадаць/паспагадаць *каму-н.*

благоизвольн:ъ, -ъи *прым.* вядомы, знакаміты, слынны, знаны.

благоиспътани:ѥ, -ꙗ *н* стараннасьць.

благокореньн:ъ, -ъи *прым.* (з) добрага роду, высакародны.

благолѣпьн:ъ, -ъи *прым.* прыгожы, цудоўны, чароўны, дзівосны.

благообразьно *прысл.* годна; з пабожным выглядам.

благообразьнъ *прым.* годны; пабожнага выгляду.

благопримичьн:ъ, -ъи *прым.* спрыяльны, зручны, ёмкі.

благоприлежьн:ъ, -ъи *прым.* старанны.

благоприꙗтьн:ъ, -ъи *прым.* прыемны, (па)жаданы.

благорастворѥни:ѥ, -ꙗ *н* удалае/прыемнае зьмяшэньне (*у зьвязку зь віном*).

благороди:ѥ, -ꙗ *н* высакароднасьць, высакародства, шляхетнасьць.

благородьн:ъ, -ъи *прым.* высакародны, шляхетны.

благословениѥ *гл.* **благословлѥниѥ**

благословенъ *гл.* **благословлѥнъ**

благословесенъ *гл.* **благословесьнъ**

благослове:сити, -шѫ, -сиши *зак.* 1. багаславіць, перахрысьціць, пеpажагнаць; 2. уславіць, усхваліць, узьнесьці хвалу.

благословествени:ѥ, -ꙗ *н* багаславеньне, багаслаўленьне, багаславенства; хвала.

благослове:ствити, -щвлѭ, -ствиши, благословеств:овати, благословесьств:овати, -оуѭ, -оуѥши *незак./зак.* 1. багаслаўляць/багаславіць; 2. услаўляць/уславіць, усхваляць/усхваліць, узносіць/узьнесьці хвалу.

благословествьн:ъ, -ъи *прым.* багаслаўлёны, услаўлены, у(с)хвалены.

благослове:стити, -щѫ, -стиши *незак./зак.* 1. багаслаўляць/багаславіць, хрысьціць/перахрысьціць, жагнаць/пеpажагнаць; 2. багаслаўляць/багаславіць, усхваляць/усхваліць, узносіць/узьнесьці хвалу.

благословесьн:ъ, -ъи *прым.* багаслаўлёны, (па)хрышчаны.

благословесьствовати *гл.* **благословествовати.**

благословещвлѥни:ѥ, -ꙗ *н* багаславеньне, багаслаўленьне, багаславенства.

благословещени:ѥ, благословешени:ѥ, -ꙗ *н* багаславеньне, багаслаўленьне, багаславенства.

благословешенъ *гл.* **благословесити.**

благослов:ити, -лѭ, -иши *тс.* **благослове:стити**

благословл ꙗ:ти, -ѭ, -ѥши *незак.* 1. багаслаўляць, хрысьціць, жагнаць; 2. багаслаўляць, усхваляць, узносіць хвалу.

благословениѥ *гл.* **благословлѥниѥ**

благословенъ *гл.* **благословлѥнъ**

благословлѥни:ѥ, благословени:ѥ, -ꙗ *н* багаслaвеньне, багаслаўленне, багаславенства.

благословлѥн:ъ, благословен:ъ, -ꙑи *прым*. багаслаўлёны, багаславёны; услаўлены, у(с)хвалены.

благословьѥнииѥ *гл*. **благословлѥниѥ.**

благословьѥнъ *гл*. **благословлѥнъ.**

благостꙑ:ни, -нꙗ *ж* дабрыня, дабрата, ласка, міласьць, (добра)зычлівасьць,

благост:ь, -и *ж* дабрыня, дабрата, ласка, міласьць, (добра)зычлівасьць.

благостьн:ъ, -ꙑи *прым*. добры, міласьцівы.

благосътвори:ти, -ѭ, -иши *зак*. зрабіць\учыніць дабро.

благотворив:ъ, -ꙑи *прым*. які робіць\чыніць дабро.

благотвори:ти, -ѭ, -иши *незак*. рабіць\чыніць дабро.

благоухани:ѥ, -ꙗ *н* водар, духмянасьць.

благоуханънъ *гл*. **благоуханьнъ**

благоуханьнъ, -ꙑи прым. духмяны, пахучы, пахкі.

благочинѥни:ѥ, -ꙗ *н* дабрадзейства, дабрачыннасьць.

благочьстив:ъ, -ꙑи *прым*. пабожны, набожны, багабойны, богабаязны.

благочьсти:ѥ, -ꙗ *н* пабожнасьць, багабойнасьць, богабаязнасьць.

благочьст:овати, -оуѭ, -оуѥши *незак*. быць пабожным\багабойным\богабаязным.

благочьстьно *прысл*. пабожна, багабойна, богабаязна.

благочьстьн:ъ, -ꙑи *прым*. пабожны, набожны, багабойны, богабаязны.

благ:ъ, -ꙑи *прым*. добры, прыемны.

благꙑ:ни, -нꙗ *ж* 1. дабро, добрае; 2. дабро, маёмасьць; багацьце; спрат; 3. дабрыня, дабрата, (добра)зычлівасьць, спагаднасьць, спагадлівасьць, ласкавасьць.

блаженик:ъ, -а *м* багаслaвенны, вялебны (*пра сьвятога*).

блажени:ѥ, -ꙗ *н* багаславеннасьць, вялебнасьць (*пра сьвятога*).

блажен:ъ, -ꙑи *прым*. 1. шчасны, шчасьлівы; 2. багаславенны, вялебны (*пра сьвятога*).

блаженьнъ *гл*. **блаженъ**

блаженьств:о, -а *н* шчасьце.

блажи:ти, -ѭ, -иши *незак*. услаўляць, усхваляць, узносіць хвалу.

блажьнъ *гл*. **блаженъ**

блазн:а, -ꙑ *ж* памылка, аблуда.

блазни:ти, -ѭ, -иши *незак*. 1. ашукваць, падманваць; 2. абураць; 3. спакушаць, зводзіць; 4. прымушаць сумецца, выклікаць суменьне.

блазни:ти сꙙ , -ѭ, -иши 1. памыляцца, быць у аблудзе; 2. абурацца; 3. блазнаваць, гаварыць блазноту.

блазн:ъ, -а *м* спакуса.

блазньничь *прым*. блазенскі, блазнаў.

блазньн:ъ, -ыи *прым.* які памыляецца, знаходзіцца ў аблудзе.
блат:о, -а балота, багна, дрыгва; твань
ближик:а, -ы *м* сваяк; блізкі, бліжні.
ближьнии I *прым.* блізкі.
ближьнии II *субст.* бліжні.
близньц:ь, -а *м уласн.* Блізьня, Блізьнюк.
близньчьн:ъ, -ыи *прым.* падвойны; дваісты.
близъ, близь *прысл. і прын.* (з Р., Д.) (ка)ля, побач, поруч, паблізу.
близь *гл.* **близъ**
блискати сѧ *гл.* **блисцати сѧ**
блиск:ъ, -а *м* маланка, бліскавіца.
блистание *гл.* **блисцание**
блисцани:е, блистани:е, -ꙗ *н* бляск, зьзяньне, зіх(а)ценьне.
блисца:ти сѧ, блиска:ти сѧ, -ѭ, -ѥши *незак.* блішчаць, зьзяць, зіх(а)цець.
блоустити *гл.* **блюсти**
бльва:ти, блюѭ, блюѥш и *незак.* ванітаваць, рыгаць, бляваць.
бльвотин:а, -ы *ж* ваніты.
бльщани:е, -ꙗ *н* 1. бляск, зьзяньне, зіх(а)ценьне; 2. блісканьне (*у часе навальніцы*); маланка, бліскавіца.
бль:щати сѧ, -ѫ, -иши *незак.* блішчаць, зьзяць, зіх(а)цець.
блѣд:ъ, -ыи *прым.* бледны.
блѣдѣ:ти, -ѭ, -ѥши *незак.* бляднець.
блюд:о, -а *н*, **блюд:ъ**, -а *м* спод (*посуд*).
блю:сти, -дѫ, -деши *незак.* 1. дбаць *пра што*, рупіцца *пра што*, глядзець *што*, даглядаць *што*, сачыць *за чым*; 2. ***кого чьто*** ахоўваць, абараняць, сьцерагчы *каго\што*, пільнаваць *каго\што, за кім\чым*; 3. ***чьто*** захоўваць *што*, прытрым(лі)вацца, трымацца *чаго.*
блюсти сѧ 1. глядзець, дбаць, сачыць, зважаць, зьвяртаць увагу; 2. ***отъ чесо*** асьцерагацца *чаго.*
блѧд:ь, -и I *м* балбатун.
блѧд:ь, -и II *ж* 1. балбатня; 2. аблуда; ерась, гарэзія; 3. распуста.
блѧдьник:ъ, -а м балбатун.
блѧдьн:ъ, -ыи *прым.* балбатлівы.
блѧ:сти, -дѫ, -деши *незак.* балбатаць, вярзьці глупства.
блѫдилищ:е, -а *н* месца распусты, дом граху, публічны дом.
блѫ:дити, -ждѫ, -диши *незак.* 1. блукаць; 2. распусьнічаць.
блѫднитьствѣ *гл.* **блѫдничьство**
блѫдолюби:е, -а *н* распуснасьць, блудлівасьць, юрлівасьць.
блѫд:ъ, -а *м* распуста, блуд.
блѫдьник:ъ, -а *м* распусьнік.
блѫдьниц:а, -ѧ *ж* распусьніца.

блждьничьск:ъ, **-ыи** *прым. прынал.* распусьнічышын, які належыць распусьніцы.

блждьничьств:о, **-а** *н* распусьніцтва, блуд; прастытуцыя.

блждьно *прысл.* 1. распусна; 2. аблудна, бязглузда, бесталкова, марна.

блждьн:ъ, **-ыи** *прым.* распусны; **блждьныи сынъ** блудны сын.

блжждени:ѥ, **-ıа** *н* распуста, блуд.

бо I *злуч.* 1. (*прычына*) бо, таму як, таму што; 2. (*вынік*) таму, праз тое; 3. (*далучэньне*) ды(й).

бо II *часьц.* (*узмацненьне*) ж(а), бо, жа бо.

бога:тити сѧ, **-щѫ**, **-тиши** *незак.* багацець, узбагачацца; быць багатым.

богат:ъ, **-ыи** *прым.* 1. багаты, заможны; 2. шчодры, багаты.

богатьстви:ѥ, **-ıа** *н* багацьце.

богатьств:о, **-а** *н* багацьце.

богатѣ:ти, **-ѭ**, **-ѥши** *незак.* багацець, узбагачацца; быць багатым.

богоавлѥниѥ *гл.* **богоıавлѥниѥ**

богобори:ѥ, **-ıа** *н* багаборства.

богоборьн:ъ, **-ыи** *прым.* багаборскі.

богоборьц:ь, **-а** *м* багаборнік, багаборца.

богоборѥни:ѥ, **-ıа** *н* багаборства.

боговесельн:ъ, **-ыи** *прым.* багарадны, рады Богу, які радуецца Богу.

боговидьц:ь, **-а** *м* хто бачыць Бога.

боговъгодьн:ъ, **-ыи** *прым.* мілы Богу.

богогодьн:ъ, **-ыи** *прым.* мілы Богу.

богодъхновен:ъ, **-ыи** *прым.* боганатхнёны.

богозъван:ъ, **-ыи** *прым.* богаабраны.

богокоторьн:ъ, **-ыи** *прым.* багаборскі, багаборніцкі.

боголѣпьно *прысл.* прыемна Богу.

боголѣпьн:ъ, **-ыи** *прым.* мілы\прыемны Богу.

боголюбив:ъ, **-ыи** *прым.* багалюбны, пабожны.

боголюбьц:ь, **-а** *м* багалюбца.

богомръзкъ *гл.* **богомрьзъкъ**

богомрьзък:ъ, **-ыи** *прым.* боганенавісны.

богомждростьн:ъ, **-ыи** *прым.* багамудры, падобны мудрасьцю да Бога, мудры праз бога.

богомждр:ъ, **-ыи** *прым.* багамудры, падобны мудрасьцю да Бога.

богонаоучен:ъ, **-ыи** *прым.* навучаны богам, дадзены ад Бога, пераняты ад бога.

богоневѣст:а, **-ы** *ж* нявеста Бога, Божая нявеста; дзяўчына, якая прызначыла сябе за нявесту Богу (*пра манашку*).

богоносив:ъ, **богоносьн:ъ**, **-ыи** *прым.* баганосны, які носіць у сабе Бога; кіраваны Богам.

богоносьц:ь, **-а** *м* баганосец.

богообразьн:ъ, -ъи *прым.* богападобны.

богопознани:ѥ, -ꙗ *н* богаспазнаньне, спазнаньне Бога.

богоприѥмьц:ь, -а *м* богапрыемца, які прымаў Бога да сябе на рукі (*звычайна пра сьв. Сымона*).

богоразоумии:ѥ, -ꙗ *н* богаспазнаньне, спазнаньне Бога.

богородиц:а, -ѧ *ж* Маці Божая\Боская, Багародзіца.

богородичин:ъ, -ъи *прым. прынал.* Маці Божай\Боскай, багародзічын.

богородичин:о, -а *н* твор у гонар Маці Божай\Боскай.

богосварьник:ъ, -а *м* багаборнік, багаборца.

богосварьн:ъ, -ъи *прым.* багаборскі, багаборніцкі.

богослове:ствити, -щвлѭ, -ствиши *незак.* услаўляць\усхваляць\хваліць Бога; прапаведаваць.

богословесьств:овати, -оуѭ, -оуѥши *незак.* услаўляць\усхваляць\хваліць Бога; прапаведаваць.

богослав:ити, -лѭ, -иши *незак.* услаўляць\усхваляць\хваліць Бога; прапаведаваць.

богословлѥни:ѥ, -ꙗ *н* навучаньне веры.

богословць *гл.* **богословьць.**

богослов:ъ, -а *м* багаслоў(нік), багасловец, тэоляг.

богословьн:ъ, -ъи *прым.* багаслоўскі, багасловецкі, багаслоўніцкі, тэалягічны.

богословьц:ь, -а *м* багаслоў(нік), багасловец, тэоляг.

богооугодьн:ъ, -ъи *прым.* мілы\прыемны Богу.

богооучен:ъ, -ъи *прым.* навучаны богам, дадзены ад Бога, пераняты ад Бога.

богочьстив:ъ, -ъи *прым.* які шануе Бога, пабожны.

богочьстивѣ *прысл.* пабожна, з пашанаю да Бога.

богочьсти:ѥ, -ꙗ *н* пабожнасьць.

богочьстьно *прысл.* пабожна, з пашанаю да Бога.

богословьц:ь, -а *м багаслоў(нік),* багасловец, тэоляг.

богочьстьц:ь, -а *м* пабожны чалавек.

богоꙗвлѥни:ѥ, -ꙗ *н* 1. зьяўленьне Бога; 2. Богазьяўленьне, Вадохрышча (*сьвята*).

бог:ъ, -а *м* бог.

богꙑ:ни, -нꙗ *ж* багіня.

божии *прым.* божы, боскі.

божьск:ъ, -ъи *прым.* божы, боскі.

божьств:о, -а *н* 1. Бог; 2. боскасьць.

божьствьн:ъ, -ъи *прым.* божы, боскі.

боле *гл.* **болѥ** II

болии *прым. выш. ст. параўн.* большы.

бол:ь, -и *м* хворы.

больми *прысл.* вельмі, надта.

больн:ъ, -ъи *прым.* хворы.

больши *прым. выш. ст. параўн.* большы.

большьми *прысл. выш. ст. параўн.* больш.
болѣзн:ь, -и *ж* 1. хвароба, немач; 2. пакуты, боль.
болѣзньн:ъ, -ъıи *прым.* 1. хворы; 2. балючы; 3. зьвязаны з хваробаю.
бол:ѣти, -ѭ, -иши *незак.* 1. хварэць; 2. адчуваць боль.
болıарин:ъ, -а *м* магнат, вяльможа.
болıарьск:ъ, -ъı и *прым.* магнацкі.
болѥ I *прым. выш. ст. параўн.* большы.
болѥ II *прысл. выш. ст. параўн.* больш, болей.
бооченъ *гл.* **богооученъ**
борени:ѥ, -ıа *н* барацьба, змаганьне.
борьц:ь, -а *м* барацьбіт, змагар.
бооучънъ *гл.* **богооученъ**
босварьнъ *гл.* **богосварьнъ**
бо:сти, -дѫ, -деши *незак.* калоць; працінаць.
бочъстивъ *гл.* **богочьстивъ**
бо зн:ь, -и *м* страх, боязь.
бо:ıати сѧ, -ѭ, -иши *незак.* ***(отъ) кого чесо*** баяцца, страшыцца, лякацца *каго\чаго.*
брад:а, -ъı *ж* барада.
брад:ъı, -ъвє *ж* сякера.
брадѣ:ти, -ѭ, -ѥши *незак.* абрастаць барадою.
бразд:а, -ы *ж* баразна, разора.
брак:ъ, -а *м* 1. шлюб; 2. вясельле.
бран:ити, -ѭ, -иши *незак.* забараняць.
брани:ѥ, -ıа *н* барацьба; змаганьне.
бран:ь, -и *ж* 1. барацьба; змаганьне; 2. бой, бітва, сеча.
браньск:ъ, -ъıи прым. ваенны.
братѣ *гл.* **братиıа**
брати (сѧ), борѭ, борѥши *незак.* змагацца, дужацца.
брати:ıа, братри:ıа, -ѩ *ж* манаская грамада, брацiя, брацтва.
бъраниѥ *гл.* **браниѥ.**
бърати *гл.* **брати (сѧ).**
братолюбьстви:ѥ, -ıа *н* братэрская любоў.
братолюбьств:о, -а *н* братэрская любоў.
братосътворѥни:ѥ, братротворѥни:ѥ, -ıа *н* пастрыжэньне ў манахі/законьнікі, пастрыг.
братриıа *гл.* **братиıа.**
братролюби:ѥ, -ıа *н* братэрская любоў.
братротворѥниѥ *гл.* **братосътворѥниѥ.**
братр:ъ, брат:ъ, -а *м* брат.
брта ? *гл.* **братиıа , братръ.**
братрьн:ь, братьн:ь, -ии *прым.* 1. братэрскі; 2. братаў.
братрьств:о, братьств:о, -а *н* братэрства.
братоучѧд:ъ, -а *м* пляменьнік, братаніч, братаў сын (*толькі*).

братъ *гл.* **братръ.**

братьнь *гл.* **братрьнь.**

братьство *гл.* **братрьство.**

брачьн:ъ, -ъи *прым.* 1. шлюбны; 2. вясельны: **брачьнии сынове** госьці на вясельлі, вясельнікі.

брашьн:о, -а *н* ежа, яда.

брашьньц:е, -а *н* 1. аплатка; прычасьце, гостыя; 2. ежа, яда.

бренив *гл.* **брьнив**

бридък:ъ, -ъи *прым.* востры; перан. пранізьлівы.

бритв:а, -ы *ж* лязо, брытва.

бръв:ь, -и *ж* вейка *або* павека.

бръвьно *гл.* **брьвьно**

бръзд:а, -ы *ж* цуглі.

бръзо *прысл.* хутка, борзда, шпарка.

бръна *гл.* **брьна**

бръние *гл.* **брьние**

бръ:нга, -ни *ж мн.* панцыр (воіна).

бръселии:е, -га *н* чарэп'е; друз.

брысал:о, -а *н* ручнік.

брьвьн:о, -а *н* бервяно.

брьзо *гл.* **бръзо**

брьн:а, -ы *ж* гразь; бруд.

брьнии:е, -га *н* гразь; бруд.

брьньн:ъ, -ъи *прым.* створаны з гразі\зямлі\пылу\гліны.

брьн *гл.* **брън**

брьселие *гл.* **бръселие**

брѣг:ъ, -а *м* 1. адхон; 2. бераг.

брѣжьн:ъ, -ъи *прым.* які мае дачыненьне да адхону.

брѣменьн:ъ, -ъи *прым.* абцяжараны.

брѣм:ѧ, -ене *н* груз; *перан.* цяжар.

брѧцании:е, -га *н* ляскат, бразгат.

боуи, -и *прым.* неразумны, разумова непаўнавартасны, вар'яцкі: **боуга словеса** бессэнсоўная гутарка.

боуиств:о, -а *н* неразумнасьць; вар'яцтва.

боук:ы, -ъве, -ъви *ж* надпіс(ы), запіс(ы).

боурьн:ъ, -ъи *прым.* навальнічны.

боур:га , -ѩ *ж* бура; навальніца.

боуест:ь, -и *ж* неразумнасьць; вар'яцтва.

бъдрост:ь, -и *ж* бадзёрасьць.

бъдр:ъ, -ъи *прым.* бадзёры.

бъдрълив:ъ, -ъи *прым.* бадзёры.

бъдѣнии:е, -га *н* бадзёраньне, чуваньне.

бъ:дѣти, -ждѫ, -диши *незак.* бадзёрыцца.

бъдр:ь, -ии *прым.* бадзёры.

бъраник *гл.* **браник**

бърати *гл.* **бьрати**

бърати сѧ *гл.* **бьрати (сѧ)**

бъхъма, бъхъмъ *прысл.* зусім, увогуле, наагул.

бъчел:а, -ы *ж* пчала.

бъшиѭ *прысл.* зусім, цалкам; увогуле, наагул.

бъва:ти, -ѭ, -ѥши *незак.* надыходзіць, станавіцца, узьнікаць, адбывацца, дзеіцца; 2. бываць.

бъили:ѥ, -ꙗ *н* расьліннасьць; зельле, быльлё.

бъилꙗ *нескл. м* (га)спадар, пан.

бъистр:ъ, -ъıи *прым.* хуткі, скоры; гатовы.

бъти, ѥсмь, ѥси; *буд.* **бѫдѫ, бѫдеши**; *аор.* **бъıхъ, бъı**; *пэрф.* **бълъ**; *імпэрф.* **бѣхъ, бэ**; *умоў.* **бимъ, би**; *заг.* **бѫди**; *дзеепрым. цяп.* **съı, сѫщии**; *дзеепрым. прош.* **бъıвъ, бъıвъши**; *герун.* **сѫтъ** 1. *незак.* a. быць; b. ***комоу, оу кого, (отъ) кого*** належаць каму; b. ***комоу***+інф. трэба, належыць, павінен, мае, мусіць; c. ***съ цѣмь*** мець інтымныя дачыненьні; d. ***чэмоу*** быць прыдатнам (да чаго); **чьто ѥсть тебэ\намъ ..** што табе\нам\.. да таго; 2. *зак.* a. адбыцца, зьдзейсьніцца, стаць, узьнікнуць, паўстаць; b. зьмяніцца; d. **быти въ себѣ, быти въ своѥмь оумѣ** ачуняць, апрытомнець.

бъити:ѥ, -ꙗ *н* існаваньне, быцьцё.

бьдръ *гл.* **бъдръ**

бьдѣние *гл.* **бъдѣние**

бьдѣти *гл.* **бъдѣти**

бьждрь *гл.* **бъждрь**

бьраниѥ *гл.* **браниѥ**

бьрати, берѫ, береши *незак.* зьбіраць.

бьчела *гл.* **бъчела**

бьшиѭ *гл.* **бъшиѭ**

бьѥниѥ *гл.* **биѥниѥ**

бѣ *форма* **быти**

бѣга:ти, -ѭ, -ѥши *незак.* 1. уцякаць, бегчы; 2. **(отъ) чесо** пазьбягаць (каго\чаго), ухіляцца (ад чаго).

